■ Вакол нас

ЭКАЛАГІЧНАЯ ВАРТА НЕ ДРЭМЛЕ

Пытанне ўрэгулявання дыскусіі з Літвой наконт будаўніцтва беларускай АЭС застаецца адкрытым. Пра гэта падчас «прамой лініі» паведаміў міністр прыродных рэсурсаў Беларусі Уладзімір ЦАЛКО.

«Мы лічым, што беларускі бок выканаў усе патрабаванні Літвы. І хоць у літоўцаў яшчэ ёсць да нас прэтэнзіі, міжнародная супольнасць нас падтрымлівае. Мы будзем працягваць дыялог», — сказаў міністр.

Адно з ключавых пытанняў падчас «прамой лініі» датычылася захавання ад знішчэння лесу каля пасёлка «Сонечны», што будуецца адразу за Мінскай кальцавой. На яго адказаў **начальнік упраўлення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы Аляксандр АНДРЭЕЎ.**

«Заканадаўства пакуль не забараняе выкарыстоўваць пад забудову лясныя плошчы, нельга будаваць толькі на сельскагаспадарчых землях, бо яны знаходзяцца ў абарачэнні і забяспечваюць нас прадуктамі харчавання. Хоць мы змагаемся за захаванне зялёнай зоны вакол Мінска, але цяпер выканкам выдзеліў дадатковыя ўчасткі, парослыя лесам, для другой чаргі забудовы пасёлка «Сонечны». І тут, на жаль, мы нічым не можам супрацьстаяць: мясцовая ўлада мае паўнамоцтвы пераводзіць адны катэгорыі земляў у іншыя і даваць іх пад забудову. Але мы пераканалі Мінгарвыканкам у тым, каб у генеральны план горада былі ўнесеныя карэктывы аб забароне размяшчэння капітальных збудаванняў у скверах і на бульварах сталіцы. Цяпер ідзе работа па замацаванні гэтага ў нарматыўных актах па ўсёй краіне».

Цікавасць выклікала захаванне прыродных ландшафтаў, а таксама «экалагічнага калідора» ўздоўж Свіслачы ў Мінску. Начальнік упраўлення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы паведаміў, што плануецца ўнясенне ў карэкціроўку генеральнага плана горада забароны на ўзвядзенне ўздоўж галоўнай воднай артэрыі сталіцы высотных будынкаў.

Паступіла пытанне пра дзеянні, накіраваныя на захаванне відаў, занесеных у Чырвоную кнігу. У сувязі з гэтым **начальнік упраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Наталля МІНЧАНКА** заўважыла: «Мы праводзім шмат акцый па ахове рэдкіх раслін, звяроў і птушак. Дарэчы, у Бразіліі сімвалам чэмпіянату свету па футболе выбралі браняносца, і з гэтай нагоды збіраюцца правесці кампанію па захаванні гэтага віду. Мы таксама думаем у межах чэмпіянату па хакеі правесці пэўныя мерапрыемствы, каб прыцягнуць увагу да нашага зубра, які з'яўляецца відам, што глабальна знікае».

Цікавіць грамадзян і міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы прыродных рэсурсаў. Адзін з міжнародных праектаў, які цяпер праводзіцца, — так званы пасляпраектны аналіз на прыкладзе распрацоўкі радовішча мелу ў Маларыцкім раёне на мяжы з Украінай. Праект фінансуецца Еўрасаюзам, даследаванні праводзіліся з удзелам беларускіх і ўкраінскіх спецыялістаў. «Мы імкнёмся паказаць, што мерапрыемствы, прадугледжаныя праектнай дакументацыяй на распрацоўку гэтага радовішча, бяспечныя для навакольнага асяроддзя», — сказаў Аляксандр Андрэеў.

«Людзей хвалююць пытанні самыя разнастайныя — ад глабальных да жыццёвых, — падсумаваў Уладзімір Цалко. — Сярод самых папулярных — узровень чысціні вады і паветра, абыходжанне з адходамі, таксама многія цікавяцца, як зменіцца клімат у бліжэйшы час і якія прыродныя рэсурсы ёсць у нашай краіне. Паступаюць пытанні ад паляўнічых наконт правілаў палявання на звяроў. Многія людзі імкнуцца дапамагчы навакольнаму асяроддзю і звяртаюцца да нас, калі бачаць парушэнні заканадаўства. Але часам супрацоўнікам міністэрства даводзіцца разбірацца і з такімі рэчамі, як, напрыклад, знікненне птушыных гнёздаў і кармушак у сувязі са спілаваннем дрэў у дварах. Мы, зразумела, у такіх выпадках тлумачым людзям, куды адрасаваць гэтыя пытанні, бо яны не ў нашай кампетэнцыі, імі павінны займацца мясцовыя органы ўлады».

Праўда, як адзначыў міністр, пры рай- і гарвыканкамах няма структуры, якая займалася б прыроднымі рэсурсамі, таму грамадзяне не бачаць іншага выйсця ў вырашэнні сваіх лакальных праблем, акрамя як звярнуцца з імі ў вышэйшую інстанцыю.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

■ Як нас дураць

ЗДАЎ КВАТЭРУ МАЦІ... 40 РАЗОЎ

Калі 32-гадовы мінчанін размясціў у сеціве інфармацыю пра здачу аднапакаёвай кватэры па вуліцы Шаранговіча, якая належала яго маці, ахвотных арандаваць яе аказалася даволі шмат. Толькі ўсе яны ў выніку аказаліся падманутымі.

Паводле інфармацыі Фрунзенскага РУУС г. Мінска, паказаўшы патэнцыяльным кватарантам кватэру, мужчына браў перадаплату — ад 300 да 1 500 долараў у залежнасці ад тэрміну пражывання. Прычым кватэраздымшчыкі атрымлівалі ад «гаспадара» распіску, што ён сапраўды атрымаў грошы. Аднак праз нейкі час мужчына пачынаў тлумачыць, што папярэднія жыльцы ніяк не з'едуць, ды і сам ён заняты, таму, маўляў, трэба крыху пачакаць. А пасля і ўвогуле адключаў тэлефон: зламыснік папросту выкідаў sim-картку, падключаў новую і зноў даваў аб'яву пра здачу кватэры.

Калі ў міліцыю звярнуліся некалькі чалавек, асобу аферыста хутка ўстанавілі — ён не ўтойваў сваіх пашпартных звестак. А вось знайсці яго напачатку не атрымлівалася. Скарыстаўшыся гэтым, зламыснік працягваў дзейнічаць па адпрацаванай схеме, падмануўшы яшчэ некалькі чалавек. У выніку махляра ўсё ж затрымалі. Як высветлілася, раней мужчына ўжо меў канфлікт з законам за крадзяжы з аўтамашын і вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі паўтара года таму. Ахвярамі «гаспадара» жылля сталі каля 40 чалавек.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

ГРОШЫ АТРЫМАЕ ТОЛЬКІ ТОЙ, ХТО ЭФЕКТЫЎНА ПРАЦУЕ

Малы, але перспектыўны

«Малы і сярэдні бізнес — адзін з нашых прыярытэтаў і перспектыва адначасова, — заявіў старшыня праўлення Банка развіцця. — Мы актыўна супрацоўнічаем з экспертамі Сусветнага банка па стварэнні дзейснай сістэмы крэдытавання гэтага сегмента эканомікі. Спадзяёмся наладзіць канструктыўнае ўзаемадзеянне з некалькімі найбольш прасунутымі ў гэтым сегменце беларускімі банкамі. Хутчэй за ўсё, крэдытаваць малы і сярэдні бізнес мы будзем праз банкі-агенты». Сума сродкаў для такіх праектаў будзе вызначана ў найбліжэйшы час.

Будаўніцтва трэцяй лініі метро

Банк развіцця прыступае сёлета да фінансавання некалькіх буйных праектаў. Напрыклад, будаўніцтва трэцяй лініі метро ў Мінску з агульным коштам праекта каля 2 млрд долараў, фінансаванне інфраструктуры Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парка (агульны аб'ём укладанняў інвестараў перавышае 30 млрд долараў). Банк пачне фінансаваць і будаўніцтва горна-ўзбагачальнага камбіната на базе радовішча «Сітніцкае», плануе ўдзельнічаць у рэканструкцыі аўтадарогі Р-23 Мінск—Мікашэвічы. «Мы чакаем, што ў бягучым годзе крэдытны партфель банка павялічыцца не менш як на 31%», — паведаміў Сяргей Румас. За 2013 Банк развіцця нарасціў крэдытны партфель у 1,6 раза (на 8,8 трлн рублёў) да 19 трлн рублёў на 1 студзеня 2014 года.

Экспарту дадуць больш

Сёлета аб'ём падтрымкі айчыннага экспарту праз Банк развіцця запланаваны на ўзроўні не менш як 80 млн долараў. «У галіне экспартнага крэдытавання мы яшчэ не выйшлі на ўстойлівую дынаміку, — прызнаў Сяргей Румас. — Намі летась быў выдадзены ўсяго адзін экспартны крэдыт нерэзідэнту на 15 млн долараў для аплаты паставак 22 «БелАЗаў» у Манголію. Але мы завяршылі падрыхтоўчую работу, напрацавалі мінімальна неабходны пакет міжнародных кантактаў і працэдур». Нацыянальны лізінгавы аператар ААТ «Прамагралізінг» пасля перадачы ў кіраванне Банка развіцця за год здолеў паставіць на знешнія рынкі тэхнікі больш, чым за тры папярэднія гады разам узятыя, падкрэсліў кіраўнік банка. Агульны кошт паставак склаў амаль 63 млн долараў. «Мы бачым, дзе можна дадаць, таму на 2014 год перад «Прамагралізінгам» пастаўлена задача выйсці на не менш як 100 млн долараў экспартных паставак».

Рэкорд па дывідэндах

У 2013 годзе Банк развіцця стаў лідарам сярод адкрытых акцыянерных таварыстваў па суме пералічаных дывідэндаў дзяржаве. У адпаведнасці з указам Прэзідэнта, усе дзяржпрадпрыемствы і акцыянерныя таварыствы з пераважнай доляй дзяржавы абавязаны рэгулярна выплачваць дывідэнды ў бюджэт. Мінімальны памер — 20% атрыманага прыбытку. «Банк развіцця пералічыў больш за 30%, або 500 млрд рублёў», — адзначыў Сяргей Румас.

Дарэчы, Банк развіцця па выніках 2013 года заняў першае месца сярод банкаў па памеры атрыманага прыбытку. Ён склаў амаль 1,6 трлн рублёў. Пры гэтым Сяргей Румас падкрэсліў, што прыбытак не з'яўляецца асноўнай мэтай дзейнасці банка, гэта хутчэй неабходная ўмова ўстойлівага існавання. Прыбытак банк цалкам накіроўвае на крэдытаванне і на сваю капіталізацыю.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.
Фота аўтара.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ФІЛАСОФІЯ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ

Камунізм у дзеянні?

ТРОШКІ ГІСТОРЫІ

Першыя крэдытныя кааператывы ўзніклі ў сярэдзіне XIX стагоддзя ў Германіі. Гэта былі кааператывы або касы ўзаемадапамогі, якія падтрымлівалі сялян падчас голаду і эканамічных цяжкасцяў. Піянер гэтага руху — Фрыдрых Вільгельм Райфайзэн (1818-1888), які задумаў ідэю кааператыўнай узаемадапамогі падчас знаходжання на пасадзе бургамістра аднаго з нямецкіх гарадоў, назіраючы за жыццём сялян, што знаходзіліся пад ціскам ліхвяроў. Ён заснаваў першы сельскі крэдытны спажывецкі кааператыў у 1864 годзе.

«Дзіўна, але ў камерцыйныя арганізацыі, дзе выдаюць пазыкі пад 2-5% у дзень, стаяць чэргі. У нас чэргаў няма, хоць максімальны працэнт, пад які мы выдаём, — 10% у месяц. Аднак многія пачынаюць заўважаць розніцу», — канстатуе кіраўнік асацыяцыі. Але камерцыйныя і некамерцыйныя арганізацыі адрозніваюцца не толькі працэнтамі па займах. Па-першае, гэта мэты стварэння: «Некамерцыйныя ствараюцца без мэты атрымання прыбытку, увесь прыбытак застаецца ў арганізацыі і накіроўваецца на патанненне паслуг; такія МФА, як правіла, маюць невялікі спектр паслуг (прыём і выдача пазык)». Толькі не трэба думаць, што нарэшце прыйшоў камунізм. Ёсць і іншыя аспекты. Па-другое, у некамерцыйнай арганізацыі няма ўласніка, а значыць, усе ўдзельнікі кааператыва з'яўляюцца яго ўласнікамі: «Калі чалавек уступае ў кааператыў, ён плаціць уступны ўзнос і пай (аналаг статутнага фонду) і становіцца сузаснавальнікам гэтай арганізацыі (усё, што ёсць у кааператыве, у пэўнай ступені належыць яму, але забраць гэта ён не можа). І тут трэба адзначыць важны момант — калі чалавек уступае ў кааператыў, ён адказвае па яго абавязацельствах. Калі кааператыў стратны (патраціў тое, што зарабіў, і ў яго нічога няма, акрамя абавязацельстваў па вяртанні ўкладаў), аўтаматычна гэтая адказнасць кладзецца на ўсіх удзельнікаў кааператыва. У гэтым выпадку нельга сказаць, што дырэктар кааператыва павінен вярнуць грошы. Гэта кругавая парука, другі бок слова «ўзаемадапамога». Калі мы ўступілі ў кааператыў, то мы адказныя за тое, што ў ім адбываецца. Таму ўдзельнікі павінны сачыць за кіраўніком, дзейнасцю, улікам, даходамі. Да нас часта людзі прыходзяць, не разумеючы, куды яны ўступілі. А вось у камерцыйнай арганізацыі ўсе страты — гэта страты заснавальнікаў». Трэба быць вельмі ўважлівым пры выбары крэдытнага кааператыва, каб прынесці грошы туды, дзе яны будуць надзейна схаваны і дзе можна абсалютна спакойна браць займы. Бо кааператывы бываюць розныя: «Аднойчы мы прыйшлі ў кааператыў, які працаваў ужо паўгода. Адкрываю асабовую справу пазычальніка — там ляжыць расходны ордар. «Калі пазычальнік грошы верне, я гэты ордэр выкіну», — кажа работнік кааператыва. «А грошы складваем у скрыначку», — дадае ён.

❍❍❍

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

У 10-Ы КЛАС — ПРАЗ КОНКУРС...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А праца прафесіяналаў павінна годна аплачвацца ў адпаведнасці з іх укладам у агульны вынік работы ўстановы адукацыі. Менавіта такую задачу мы ставім перад распрацоўшчыкамі новай сістэмы аплаты працы педагогаў.

Сяргей Маскевіч адзначыў, што работа над зместам і якасцю адукацыі з'яўляецца для галоўнага адукацыйнага ведамства прынцыпова важнай, і назваў захады, якія плануецца ў гэтым напрамку ажыццявіць. У парадку эксперыменту распачнецца апрабацыя незалежнай выніковай атэстацыі школьнікаў пасля завяршэння навучання на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. А пасля завяршэння эксперыменту будзе прымацца рашэнне аб мэтазгоднасці правядзення ў 2015/2016 навучальным годзе незалежнай атэстацыі ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі і ўвядзенні конкурснага набору ў 10-ты клас.

Па словах міністра, будуць падрыхтаваны змяненні ў рэкамендацыі па арганізацыі вывучэння прадметаў на павышаным узроўні. Выбар вучэбных прадметаў не павінен абмяжоўвацца толькі чатырма профілямі. Да таго ж кіраўнікам будзе дадзена магчымасць праводзіць прамежкавую атэстацыю па вучэбных прадметах — у залежнасці ад узроўню іх навучання — па вучэбных чвэрцях, трыместрах або паўгоддзях. Будуць таксама ўнесены змены ў раней зацверджаныя крытэрыі і паказчыкі дзейнасці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і размежаваны крытэрыі для ліцэяў, гімназій і сярэдніх школ.

— Асобна хацеў бы падкрэсліць важнасць удасканалення як зместу, так і методык навучання замежным мовам. Нацыянальнаму інстытуту адукацыі прапаную разгледзець магчымасць укаранення ў Беларусі незалежнай міжнароднай сістэмы ацэньвання ўзроўню валодання англійскай мовай TOEFL, а таксама рыхтаваць школу да міжнароднай сістэмы ацэньвання вучэбных дасягненняў PISA, — дадаў Сяргей Маскевіч.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Кашалёк

ПЕРАВОДЫ «МІГАМ» ПРЫПЫНЕНЫ

Сродкі, якія там «завіслі», вярнуць вельмі складана

На тэрыторыі Беларусі ўдзельнікі міжнароднай прыватнай аплатнай сістэмы «Мігам» Белаграпрамбанк, Банк ВТБ (Беларусь), БПС-Сбербанк, Банк БелВЭБ часова прыпынілі, а Тэхнабанк спыніў аперацыі па ажыццяўленні грашовых пераводаў праз гэтую аплатную сістэму, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

Нагадваем, што разліковым цэнтрам аплатнай сістэмы «Мігам» з'яўляецца камерцыйны Еўрапейскі трастaвы банк. З 11 лютага 2014 года Цэнтральным банкам Расіі адклікана ліцэнзія гэтай крэдытнай арганізацыі на ажыццяўленне банкаўскіх аперацый. У сувязі з гэтым Дзмітрый Янін, старшыня праўлення Канфедэрацыі таварыстваў спажыўцоў краін СНД, учора заявіў: «На жаль, банкаўскія пераводы без адкрыцця рахунку не застрахаваны. Таму тыя грошы, якія «павіслі», могуць быць вернуты, напэўна, толькі ў межах крымінальнай справы. Але не праз сістэму страхавання ўкладаў. Для людзей, якія працуюць па-за рэспублікай, зараз лепей больш уважліва паглядзець, якія заснавальнікі стаяць за той ці іншай плацежнай сістэмай, і, калі яе радзіма знаходзіцца ў крызісе, то пашукайце іншага аператара. Можа быць, на паўпрацэнта даражэйшага». Галоўны банк краіны рэкамендуе фізічным асобам для ажыццяўлення і атрымання грашовых пераводаў выкарыстоўваць іншыя міжнародныя аплатныя сістэмы, што функцыянуюць на тэрыторыі нашай краіны.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

40 ХВІЛІН З ЖЫХАРАМІ РЭГІЁНА

Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР выступіў на канале «Беларусь-2» у эфіры брэсцкага тэлебачання з першым выпускам праграмы «40 хвілін з губернатарам».

На самым пачатку праграмы губернатар адзначыў важнасць стасункаў з жыхарамі рэгіёна ў любым фармаце: асабістыя прыёмы грамадзян, «прамыя лініі», выступленні ў СМІ. «Але на «прамую лінію» не ва ўсіх атрымліваецца дазваніцца, тым больш не ўсе могуць трапіць на асабісты прыём, — сказаў кіраўнік вобласці. — Таму было прынята рашэнне гаварыць з жыхарамі вобласці з экрана тэлебачання, каб пра набыткі і праблемы рэгіёна інфармацыю з першых вуснаў атрымала максімальна вялікая аўдыторыя».

Першая перадача была прысвечана вынікам мінулага года, развіццю эканомікі і сацыяльнай сферы вобласці. Наступная праграма анансавана як аналіз і вынікі зваротаў грамадзян за апошні час. Як паведамілі ў прэс-службе губернатара, тэматыка і фармат перадачы, магчыма, будуць мяняцца для таго, каб зрабіць яе найбольш цікавай. Чакаецца, што кіраўнік вобласці будзе выходзіць у эфір кожны месяц.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ЗАЛАТЫ БРЭНД БЕЛАРУСБАНКА

Аўтарытэтнае міжнароднае фінансавае выданне The Banker (выдавецтва The Financial Times Ltd.) апублікавала рэйтынг самых дарагіх банкаўскіх брэндаў у свеце «The Top 500 Banking Brands». Паводле гэтага рэйтынгу, сёлета ўпершыню айчынны банкаўскі брэнд акцыянернага таварыства «АСБ Беларусбанк» быў прызнаны адным з самых дарагіх у свеце, паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе фінансавай установы.

Асноўным фактарам для ацэнкі кошту банкаўскага брэнда з'яўляецца пазнавальнасць яго менавіта кліентамі фінансавай сферы. У падобных разліках выкарыстоўваецца шэраг такіх паказчыкаў, як дзейнасць у розных відах бізнесу, у тым ліку рознічнага і карпаратыўнага, страхаванне, кіраванне актывамі, інвестыцыйна-банкаўская дзейнасць і работа з плацежнымі карткамі. Нагадаю, што ў спісе «The Top 500 Banking Brands» наш родны Беларусбанк размясціўся на 480-й пазіцыі, дзе яго брэнд ацэнены ў 159 млн долараў.

Сяргей КУРКАЧ.

СПУЖАЛІСЯ, АЛЕ НЕ ПАЦЯРПЕЛІ

Рэйсавы аўтобус, які раніцай рухаўся з Веткі ў вёску Неглюбка, нечакана загарэўся. Як расказалі ў прэс-службе МНС, падчас пажару маторнага адсека ў «МАЗа» заклініла дзверы. У салоне ў гэты момант знаходзіліся 15 пасажыраў.

Адзін з пасажыраў патэлефанаваў выратавальнікам, якія праз пяць хвілін былі на месцы здарэння, але нечаканая дапамога прыйшла яшчэ раней. Кіроўца Веткаўскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Анатоль Жураўлёў у гэты час рухаўся на машыне насустрач, у Ветку. Мужчына заўважыў ля ўзбочыны аўтобус, з салона якога ішоў чорны дым. Сяржант спыніўся і, зразумеўшы, што дзверы заблакіраваны, стаў дапамагаць людзям выбірацца праз кабіну кіроўцы. Калі пачалася паніка, выратавальнік разбіў вокны і некаторых людзей выцягнуў праз акно. У выніку ніхто з пасажыраў аўтобуса не пацярпеў.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ВАС ЧАКАЮЦЬ ЗНІЖКІ!

У рознічнай гандлёвай сетцы краіны 16 лютага і 2 сакавіка пройдзе акцыя «Адзіны дзень зніжак».

Як паведамілі ў Міністэрстве гандлю, у гэтыя дні ў многіх крамах рэспублікі за кошт узгодненага зніжэння цэн з боку арганізацый-вытворцаў і гандлёвых надбавак ужо з боку гандлёвых арганізацый пакупнікам прапануюць зніжкі на нехарчовыя тавары. Іх памер павінен скласці не менш за 15-20 працэнтаў. Усіх запрашаюць па пакупкі.

ХАБАРНІЦТВА Ў БНТУ

Упраўленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі ГУУС Мінгарвыканкама і аператыўныя супрацоўнікі Савецкага РУУС сталіцы выявілі факты незаконнага атрымання грашовых сродкаў кіраўніком адной з кафедраў і выкладчыкамі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Па гэтых фактах упраўленнем Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па г. Мінску заведзены крымінальныя справы. Дзеянні падазраваных кваліфікаваны як атрыманне хабару: высветлена, што выкладчыкі прымалі незаконныя грашовыя ўзнагароджанні ў замежнай валюце за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, звязаных са здачай іспытаў і курсавога праекта. Цяпер праводзяцца аператыўна-следчыя мерапрыемствы, накіраваныя на высвятленне ўсіх абставін гэтых злачынстваў. Даследуюцца прычыны і ўмовы, якія садзейнічалі здзяйсненню карупцыйных злачынстваў у сценах установы адукацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 февраля 2014 года проводит 1-ый повторный открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности на 2-ом открытом аукционе

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
3	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 17703001 дв. 440018 корп. 7702Ф101 1977 г. 4 кат. 2543 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1977 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1977 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	110 000 000	11 000 000
5	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 17710003 дв. 472462 корп.17710003 1977 г. 4 кат. 2081 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1977 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № б/н 1977 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1977 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	110 000 000	11 000 000
6	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 17712002 дв. 481253 корп.17712002 1978 г. 4 кат. 2586 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1978 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 92п29 1978 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1978 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	110 000 000	11 000 000
8	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18305001 дв. 806633 корп.8304Ф102 1983 г. 4 кат. 2307 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1983 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 41п48 1983 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1983 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	120 000 000	12 000 000
9	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18412003 дв. 900803 корп. 8411Ф104 1985 г. 4 кат. 4870 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1985 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 49п198 1985 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1985 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	110 000 000	11 000 000
10	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18606002 дв. 965867 корп.18606002 1986 г. 4 кат. 1668 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1986 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № б/н 1986 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1986 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	120 000 000	12 000 000
11	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18501001 дв. 904320 корп.8411Ф102 1985 г. 4 кат. 3068 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1985 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 67п171 1985 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1985 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	120 000 000	12 000 000
12	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18606004 дв. 002175 корп.18606004 1986 г. 4 кат. 2534 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1986 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 32п71 1986 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1986 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	110 000 000	11 000 000
13	Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18302003 дв. 800970 корп.18302003 1983 г. 4 кат. 1312 км , Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1983 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № б/н 1983 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1983 г. 4 кат.	г. Ст. Дороги, в/ч 42747	120 000 000	12 000 000

Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 24.01.14 № 13.
Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: **www.bsk.by, mail@bsk.by.**

УНП 101099370

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 27 марта 2014 года проводит 4-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
42	Грузовой КрАЗ-250 ш. 522345 дв. 917779 1985 г. 4 кат. 1251 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000
43	Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. 146654 дв. 599430 1990 г. 3 кат. 77144 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
44	Грузовой Урал-4320-0010-01 ш. 123553 дв. 441400 1989 г. 4 кат. 136480 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000
45	Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 140219 дв. 548606 1990 г. 4 кат. 74856 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
46	Грузовой Урал-43202 ш. LO105165 дв. 311554 1988 г. 4 кат. 74220 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000
47	Грузовой Урал-43202 ш. 045560 дв. 811762 1985 г. 3 кат. 77460 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	40 000 000	4 000 000
48	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 162649 дв. 706908 1990 г. 3 кат. 56329 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
49	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 154611 дв. 652875 1990 г. 4 кат. 42781 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	50 000 000	5 000 000
50	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 022427 дв. 578180 1984 г. 4 кат. 17866 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
51	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 021709 дв. 571144 1984 г. 4 кат. 18550 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
52	Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 039488 дв. 761833 1985 г. 3 кат. 36469 км	г. Старые Дороги, в/ч 48668	45 000 000	4 500 000
53	Шасси КрАЗ-257 ш. 46663 дв. 10310 1965 г. 4 кат. 23711м	д. Красное, в/ч 52242	30 000 000	3 000 000
54	Грузовой бортовой КамАЗ-43101 ш. 013375 дв. 594763 1990 г. 4 кат. 82099 км	г. Гродно, в/ч 41780	45 000 000	4 500 000
55	Грузовой бортовой КамАЗ-43101 ш. 003302 дв. 475700 1989 г. 3 кат. 132252 км	г. Новогрудок, в/ч 75158	40 000 000	4 500 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **27 марта 2014 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 24 марта 2014 года**.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

Извещение о проведении 17 марта 2014 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)	Помещение неустановленного назначения 139 общей площадью 20,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 58-139 (инвентарный номер 500/D-70772990)
Начальная цена	447 609 000 белорусских рублей
Сумма задатка	44 000 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22
Балансодержатель	СООО «Столичный центр»

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 17 марта 2014 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 17.02.2014 по 12.03.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 327-40-22 –
УП «Минский городской центр недвижимости».

Извещение о проведении 17 марта 2014 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

Предмет торгов (наименование, местонахождение, характеристики продаваемого имущества)	Изолированное (административное) помещение общей площадью 18,8 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, д. 6Б, пом. 1 (назначение: административное помещение, инв. номер 500/D-700691)
Начальная цена	445 569 000 белорусских рублей
Сумма задатка	44 000 000 белорусских рублей
Организатор аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, (017) 327-40-22
Балансодержатель	ООО «Главгорэксплуатация»

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион проводится 17 марта 2014 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 17.02.2014 по 12.03.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 327-40-22 –
УП «Минский городской центр недвижимости».

Утерянную печать ОДО «Акрил-Строй» УНП 191039380 **считать недействительной.**

УНП 191197208.